**С. А. МАШКАНАВА**,
настаўніца ДУА «Суражская дзіцячы сад — сярэдняя школа імя Героя Савецкага Саюза М. П. Шмырова»
Віцебскага раёна

# ЯКУБ КОЛАС. «ХМАРКА». Алегарычны змест і патрыятычны пафас твора

## (урок у VIII класе)

Мэты: садзейнічаць разуменню вучнямі мастацкай адметнасці Коласавых «Казак жыцця» — спалучэнне алегарычнага і рэальнага, раскрыць ідэйна-філасофскі змест твора «Хмарка».

Задачы: спрыяць выпрацоўцы навыкаў аналізу твора, развіццю вуснага маўлення, аналітычнага мыслення; садзейнічаць выхаванню ў васьмікласнікаў пачуцця любові да роднага краю.

Абсталяванне: вучэбны дапаможнік для VIII класа, тэставыя заданні.

Тэхналогія: урок з элементамі развіцця крытычнага мыслення.

Эпіграф:

Не шукай ты шчасця, долі
На чужым, далёкім полі.

*Янка Купала.*

### Ход урока

**I. Арганізацыйна-матывацыйны этап.**

Настаўнік. Мне вельмі прыемна зноў пабачыцца з вамі. Паглядзіце, калі ласка, адзін на аднаго. Мы разам — і гэта цудоўна! Усміхніцеся і праз усмешку паспрабуйце перадаць свой добры настрой нашым гасцям. Спадзяюся, вы ўсе падрыхтаваліся да заняткаў. А сёння ў нас не проста ўрок літаратуры, а ўрок жыцця.

**II. Этап актуалізацыі раней вывучанага.**

Выкананне тэставага задання.

Настаўнік. Перад тым як пачаць аналіз твора, прапаную вам выканаць тэставае заданне па тэме «Лірычныя жанры» (узаемаправерка).

**Тэставае заданне**

1. Што адлюстроўваюць лірычныя жанры?

а) Жыццё праз уражанні і пачуцці аўтара;
б) жыццё праз погляды і ўяўленні народа;
в) жыццё праз канфлікт герояў.

2. Што ў лірычным творы на першым плане?

а) Эмоцыі, перажыванні, рух пачуццяў;
б) падзеі;
в) тэма.

3. Якім словам старажытныя грэкі называлі вершы, якія чыталіся пад акампанемент ліры?

а) Акампанементыкос;
б) лірыкос;
в) эпас.

4. Што раскрывае перад намі лірычная паэзія?

а) Знешні выгляд чалавека;
б) унутраны свет чалавека;
в) апісанне прыроды.

5. Які твор, як правіла, не мае сюжэта?

а) Эпічны;
б) лірычны;
в) драматычны.

6. У якой форме звычайна пішуцца лірычныя творы?

а) Маналогу;
б) дыялогу;
в) маналогу і дыялогу.

7) Мова лірычных твораў найчасцей:

а) вершаваная;
б) празаічная;
в) празаічная і вершаваная.

**Адказы:** 1 — а; 2 — а; 3 — б; 4 — б; 5 — б; 6 — а; 7 — а.

**III. Вывучэнне новай тэмы.**

Настаўнік. Вы ўжо звярнулі ўвагу, што мы зноў звяртаемся да творчасці класіка нашай літаратуры Якуба Коласа. Твор «Хмарка» ўваходзіць у цыкл «Казкі жыцця». Чаму казкі? І чаму казкі жыцця? Цыкл «Казкі жыцця» складаецца больш як з трыццаці невялікіх твораў, якія пісьменнік ствараў на працягу амаль паўстагоддзя (1908—1956). Звярніце ўвагу на эпіграф да ўрока.

Як вы мяркуеце, што мы павінны зрабіць на ўроку і для чаго? *(Вучні фармулююць асноўныя задачы ўрока.)*

**Галоўная думка ўрока:** Бязмежны свет — дом для чалавека, які жыве ў непадзельным адзінстве з усім, што існуе навокал.

Гутарка па пытаннях.

1) Чаму казка Якуба Коласа «Хмарка» адносіцца да эпічных твораў? *(Казцы ўласцівы апавядальнасць, падзейнасць і займальнасць сюжэта.)*

2) Сваімі словамі перадайце, як адчувала сябе Хмарка ў падарожжы, з кім яна сустрэлася і якую праўду аб жыцці пачула. *(Хмарка была шчаслівая і вясёлая, не заўважала няшчасця іншых вакол сябе.)*

3) Што змянілася ў поглядах Хмаркі на жыццё пасля доўгага і далёкага падарожжа? *(Пасля нараканняў Арла Хмарцы зрабілася прыкра. Цяпер яна не адчувала сябе шчаслівай і вольнай.)*

4) Твор «Хмарка» — казка ці апавяданне? *(Казка.)*

5) Якая асноўная думка твора? *(Чалавек у пошуках гармоніі, у роздуме над праўдай і маной, над тым, што ёсць зло, а што дабро і што складае аснову жыцця як чалавека, так і прыроды.)*

6) Якую ролю ў творы адыгрываюць малюнкі прыроды? *(Малюнкі прыроды адыгрываюць вялікую ролю. У пачатку твора прырода паказваецца спакойнай, шматколернай, а ў канцы яна ўжо пажоўклая, зажураная.)*

7) У залежнасці ад чаго змяняюцца фарбы, адценні ў абмалёўцы прыродных з'яў? *(Фарбы змяняюцца ў залежнасці ад таго, як Арол расказвае Хмарцы аб нягодах і нястачах на зямлі. Ён вінаваціць ва ўсім бесклапотную Хмарку.)*

8) Параўнайце казку «Хмарка» і верш «Хмарка» Якуба Коласа. Што агульнае ў гэтых творах?

**Хмарка**

Па небе хмарка залатая
На сівер з поўдзеня плыла,
І ўздых палёў, жаданні гаю
У сабе хмурыначка нясла.

А сонца горача сушыла,
І сохлі нівы на палёх,
Даўно зямля дажджу прасіла,
Але яе не слухаў Бог.

І ўсё заціхла, ўсё чакала
Дажджу ад хмаркі паўднявой.
Хістацца краска перастала,
Прыпаўшы к долу галавой.

Глядзеў і лес, і луг з травою,
І ўсе расліны на зямлі:
Вось хмарка чыстаю слязою
Спадзе на зніклыя палі.

І ў неба дойдзе плач з туманам,
Што сінім дымам ціха зніс
Над цёмным лесам і курганам,
І ліне дожджыкам наніз.

Плыве хмурынка ў божым полі,
Як бы на моры астравок;
Яна ж не чуе крыку болі —
Яна схавалась за лясок.

*1910*

*(І ў вершы, і ў казцы Хмарка паказана аўтарам бесклапотнай. Яна не заўважае гора іншых, тых, хто пакутуе, хто чакае яе з нецярплівасцю, каб пралілася дажджом на палі, гаі, зямлю, кветкі, лес.)*

Фізкультхвілінка (гімнастыка для вачэй).

**IV. Кантрольна-рэфлексійны этап.**

**1. Выкананне тэставага задання (узаемаправерка).**

**Тэставае заданне**

**1. Калі з'явілася Хмарка?**

а) Увечары; б) раніцай; в) ноччу.

**2. Чым спачатку была Хмарка?**

а) Маленькім беленькім камячком;
б) вялікім пухнатым воблакам;
в) чорным камячком.

**3. Колькі Хмарка плыла па небе?**

а) Два дні;
б) пяць дзён;
в) увесь дзень.

**4. Што ўбачыла Хмарка?**

а) Горы; б) лес; в) возера.

**5. Да каго прыхілілася Хмарка?**

а) Да дрэва; б) да скалы; в) да слупа.

6. Хто размаўляў з ёй?

а) Арол; б) Сокал; в) Верабей.

7. Як адчувала сябе Хмарка пасля наракання Арла?

а) Добра; б) сумна; в) прыкра.

8. Куды яна прыляцела?

а) У свой край;
б) на чужыну;
в) засталася на гары.

9. Каго павучаў стары Дуб?

а) Арла; б) Бусла; в) Хмарку.

**Адказы:** 1 — б; 2 — а; 3 — в; 4 — а; 5 — б; 6 — а; 7 — в; 8 — а; 9 — б.

2. Складанне сінквейна да слова «хмарка».

**Хмарка**
Бесклапотная, шчаслівая.
Не заўважае, не бачыць, бадзяецца.
Шчаслівая хмарка не заўважае
цяжкага жыцця навокал.
Чужына.

**Ліст самаадчування**

1. Ці спадабаўся вам урок? ________
2. На якую адзнаку вы працавалі на ўроку?
________________
3. Ацаніце ваш настрой на ўроку ў балах:
1 2 3 4 5 6 7 8 9 10

**V. Дамашняе заданне.** Прачытаць яшчэ адно апавяданне з цыкла «Казкі жыцця», падрыхтаваць яго аналіз.